Важным фактарам удасканалення работы на факультэце выступае мэтанакіраваная актывізацыя асабістага патэнцыялу студэнтаў. Відавочна неабходнасць пераўтварэння студэнта з пасіўнага рэцыпіента зададзеных інфармацыйных патокаў у актыўнага ўдзельніка засваення, фарміравання і мадыфікацыі дынамічнай сістэмы прафесійных ведаў і навыкаў. Як крок у гэтым накірунку можна разглядаць укараненне ў практыку падрыхтоўкі студэнтаў з улікам спецыялізацыі свабоднага выбару прафілюючых дысцыплін.

На першым этапе рэалізацыі гэтай задумы кафедры вызначаюць цыклы курсаў, якія складаюць тэарэтычнае ядро будучай спецыяльнасці. З'яўляючыся абавязковым кампанентам прафесійнай падрыхтоўкі, яны займаюць каля 50% фонду гадзін, якія адводзяцца на спецыялізацыю. Астатнія гадзіны ў адпаведнасці з вучэбнымі планамі размяркоўваюцца паміж спецдысцыплінамі, канкрэтны выбар якіх складаецца з улікам студэнцкай аўдыторыі.

Такі падыход да фарміравання комплексу дысцыплін па спецыялізацыі, з аднаго боку, павышае адказнасць кафедраў і выкладчыкаў за спецкурсы. З другога боку, садзейнічае актыўнаму ўключэнню студэнтаў у арганізацыю вучэбнага працэсу на старшых курсах, дазваляе цесна звязаць вучобу з патрабаваннямі практыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Мацкевіч Л.С.**, ст. выкладчык*

## СЛАВЕСНАЕ ДЗЕЯННЕ ЯК ПРАЦЭС МОЎНЫХ ЗНОСІН

Асновы моўных ведаў і ўменняў для студэнтаў факультэта завочнага навучання закладваюцца ў гады вучобы ў сценах універсітэта культуры. Пры гэтым увесь комплекс моўнай дзейнасці студэнта-завочніка, усе формы яго творчага, вучэбнага, грамадскага жыцця, падмацаваныя

сістэмай моўнага навучання, могуць і павінны спрыяць замацаванню прафесійных навыкаў валодання словам.

У навучальным працэсе самае інтэнсіўнае ўздзеянне на якасць мовы пачынаецца па меры сутыкнення з літаратурным і драматургічным матэрыялам, якое ставіць перад выканаўцам сур'ёзныя творчыя задачы. Механізм моўнай здольнасці фарміруецца ў кожнага чалавека на аснове яго прыроджаных псіхафізічных асаблівасцей пад уплывам моўных зносін. Слова робіцца дзейсным, дакладным і выразным пры накіраванасці ўсяго псіхафізічнага апарату на выкананне патрэбных задач.

Чалавек не прыстасоўваецца да сваіх першапачаткова існуючых моўных магчымасцей, а актыўна фарміруе і развівае іх дзякуючы "апераджальнаму адлюстраванню рэчаіснасці", дзякуючы здольнасці прадбачыць і спланаваць. Гэтая ўласцівасць распаўсюджваецца на ўсе значныя для нас "складаючыя" мовы, дазваляе ў працэсе творчай працы ў той ці іншай ступені рэгуляваць патрэбныя якасці. Пад кантролем педагога навык, сфарміраваны ў моўна-галасавым трэнінгу, падмацоўваецца і становіцца зусім звыклым, выпрацоўваецца ў моўна-галасавое ўменне па меры авалодання задачамі моўнага дзеяння. Пры ўмелай арганізацыі засваення навыкаў і арганізацыі самога працэсу навучання мы можам актыўна паўплываць на фарміраванне характару і на якасць мовы.

Мэтанакіраванае ўздзеянне на ўласцівасці, якасць мовы можа даваць добрыя вынікі ва ўмовах работы над роллю ці літаратурным тэкстам, у якіх магчымы адбор моўных прыстасаванняў не толькі свядомы, але і інтуітыўны, які фарміруецца пад уплывам прапанаваных абставін ролі і яе стылістыкі. Важнай з'яўляецца і яшчэ адна акалічнасць: выразныя ўласцівасці мовы карэняцца ў яе арыентацыі, а таксама ў мэтах і ўмовах гутаркі. У працэсе творчай работы над літаратурным тэкстам выкладчык сцэнічнай мовы, які прапануе канкрэтныя ўласныя рашэнні, мае магчымасць стварыць абставіны, пры якіх патрэбныя дадзенаму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выканаўцу моўныя якасці можна развіваць мэтанакіравана і больш рэзультатыўна.

На занятках па сцэнічнай мове студэнтаў-завочнікаў мастацкае слова выступае як сродак выхавання моўнай выразнасці, а не самамэта. Таму асаблівае значэнне ў рабоце над літаратурна-мастацкім матэрыялам набывае не праблема стварэння твора пэўнага жанру, а пытанні авалодання мастацтвам мовы ў працэсе творчага ўзаемадзеяння.

Кажучы пра мастацкае слова ў дачыненні да задач выхавання чытальніка, акцёра, мы па сутнасці маем на ўвазе майстэрства мастацкага апавядання, якое па сваіх прыёмах адрозніваецца ад некаторых іншых накірункаў мастацтва слова. Работа вядзецца менавіта ў плане апавядання аб падзеях слухачам.

К.Станіслаўскі і У.Неміровіч-Данчанка неаднаразова звярталіся да праблемы мастацкага чытання, якая паўстае ў ходзе выхавання акцёра. Яны выступалі супраць дэкламацыйнай, пафаснай манеры чытання. Яшчэ ў 20-я гг. К.Станіслаўскі лічыў, што агульнапрыняты тады метад работы па дэкламацыі наносіць шкоду выхаванню акцёра, вучыць пафасу, штучнаму тону, прывівае штампы, ідзе ўразрэз з патрабаваннямі акцёрскага майстэрства. Таму К.Станіслаўскі катэгарычна адмаўляўся ад гэтага метаду, падкрэсліваў, што работа над тэхнікай мастацкага слова заключаецца не ў стварэнні спецыфічных "чытальніцкіх" навыкаў, а ў развіцці моўнага майстэрства выхавання і ў практычнай трэніроўцы моўнай тэхнікі. К.Станіслаўскі сцвярджаў, што аснова поспеху гэтай працы закладзена ў адзінстве метадаў заняткаў па майстэрстве акцёра і па сцэнічнай мове. Таму ён патрабаваў, каб заняткі па мастацкім слове бралі свой пачатак у пазіцыі майстэрства акцёра. У гэтым выпадку работа па мастацкім слове прынясе, на думку К.Станіслаўскага, сур'ёзную карысць.

Лічачы асноўным сродкам сцэнічнага выяўлення акцёра дзеянне, К. Станіслаўскі не рабіў розніцы паміж майстэрствам сцэны і майстэрствам слова. Сутнасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

славеснага дзеяння не змяняецца ў залежнасці ад змены аб'екта зносін. І пры чытанні прозы трэба не чытаць, а дзейнічаць. Не выпадкова ў сваіх пазнейшых нататках аб сцэнічнай мове ён гаворыць пра чытанне як пра дзеянне. К.Станіслаўскі піша ў праграме па сцэнічнай мове: "Не чытаць, а дзейнічаць дзеля якога-небудзь аб'екта, якой-небудзь мэты (Жывы аб'ект на сцэне ці ў глядзельнай зале). Дзеля гэтага спачатку расказаць сваімі словамі, коратка, кампактна, з захаваннем логікі і паслядоўнасці, ідучы па ўнутранай лініі, змест апавядання, аповесці, запісаць гэтую ўнутраную лінію, па якой трэба ісці.

Выканаць гэтую лінію ў славесным дзеянні (а не ў дакладзе і балбатанні слоў) – гэта значыць прачытаць па вызначанай лініі.

Тое ж па лініі бачанняў.

Бачанні маляваць па эпізодах...

Падзяліць эпізоды на складаючыя дзеянні.

Чытаць (дзейнічаць) для каго-небудзь, для чаго-небудзь па эпізодах, бачаннях, уяўляемых дзеяннях.

Тое ж – апавяданне...

Тое ж – з чытаннем п'есы па ролях.

Таксама К.Станіслаўскі лічыў, што, як у рабоце над роллю ў чытанні апавядання асноўную ролю выконваюць звышзадача і скразное дзеянне, перспектыва мовы, логіка і паслядоўнасці, лінія думак і бачанняў, веды, тое, для чаго вядзецца апавяданне, якія думкі і адчуванні жадае выканаўца абудзіць у слухача, з якой творчай задачай выйшаў ён сёння на сцэну.

К.Станіслаўскі лічыў, што акцёрскі шлях у рабоце над літаратурным тэкстам дае магчымасць трэніраваць, выхоўваць на занятках па сцэнічнай мове элементы псіхатэхнікі. "Трэніруючыся на апавяданнях і маналогах ... вы навучыцеся дзейнічаць словам у ролях".

Славеснае дзеянне з'яўляецца тым вынікам працы над тэкстам, у якім вырашаюцца ўсе задачы, раскрываюцца ўсе думкі і пачуцці, выяўляецца асноўная ідэя. У імя апошняй чытальнік публічна выконвае дадзены літаратурны твор.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Славеснае дзеянне - гэта тая канчатковая мэта, на якую накіравана ўся падрыхтоўчая работа чытальніка. Гэта той абагульняючы гэтую работу сродак, праз які чытальнік раскрывае перад аўдыторыяй літаратурны твор, што ён выконвае. Славесным дзеяннем правяраецца не толькі майстэрства дадзенага выканаўцы ўвогуле, але і ступень яго разумення дадзенага твора.

Правёўшы вялікую паглыбленую работу над тэкстам, выявіўшы для сябе ўсе адзнакі, меркаванні, выпрацаваўшы актыўныя адносіны, зразумеўшы і адчуўшы з'явы, вобразы, створаныя аўтарам, чытальнік, калі падыходзіць да моманту выканання твора, раскрывае перад слухачамі ўсе назапашаныя ўражанні, імкнучыся захапіць імі творчае ўяўленне аўдыторыі. І паколькі ўся папярэдняя работа была накіравана на дакладнае і найбольш поўнае разуменне аўтарскіх думак, ідэй, то і славеснае дзеянне павінна быць скіравана да вырашэння наступнай агульнай задачы: раскрыць перад слухачом задачу аўтара, аснову яго твора. Раскрыць у пэўным гучанні, актыўнай трактоўцы, у перадачы сваіх унутраных уяўленняў і дзейснага падтэксту, якія народжаны на аснове дакладна зразуметых аўтарскіх ідэйна-творчых установак.

Славеснае дзеянне, пазбаўленае фізічных прыстасаванняў, канцэнтруе ўсю ўвагу аўдыторыі на слове. Таму і наша майстэрства законна называецца мастацтвам слова, мастацкай мовы, гучнага слова. І таму мастацтва слова, мастацтва мовы, сцэнічная мова ў параўнанні з драматычным мастацтвам патрабуюць дадатковых псіхалагічных прыстасаванняў, якія актывізуюць гучную мову і кампенсуюць бачныя сцэнічныя прыстасаванні ў іх успрыняцці слухачамі.

Перадаючы праз славеснае дзеянне сваё разуменне, суб'ектыўнае ўспрыняцце твора, чытальнік не выяўляе рыс аблічча і характару дзеючага персанажа, раскрывае свае адносіны да яго і да твора ў цэлым, удзяляючы ўвагу асобнаму вобразу толькі ў той меры, у якой гэта найбольш прадуктыўна для таго, каб данесці задуму аўтара. Гэтая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўмова вызначае дакладнасць выразэння, педагагічную аснову работы і творчую самастойнасць выканаўцы.

“Калі слова пераўвасабляецца акцёрам у самадастатковы элемент, тады прыпыняецца дзейсны працэс і пачынасцца словагаварэнне”, – піша Г.Ганчароў. Славеснае дзеянне – наняцце шырокае і шматмернае. Славеснае дзеянне – гэта значыць практычна моўныя зносіны. Яно шматслоўнае, эмацыянальнае, загружанае пазатэкставым зместам, прасякнутае індывідуальнымі якасцямі і выразнымі сродкамі асобы.

Гаворачы аб славесных дзеяннях як аб моўных зносінах, падкрэслім, што зносіны – абавязковая ўмова жыцця і дзейнасці чалавека. Актыўнасць і пасіўнасць, жаданне гаварыць з іншымі і адмова ад зносін, імкненне да кантактаў і адыход ад іх, ажыўленая спрэчка і ўпартае маўчанне – усё гэта формы ўзаемадзеяння чалавека са светам. У іх заўсёды ёсць акрэслены змест, інфармацыя аб асобе і яе адносінах з рэчаіснасцю, пэўная мэта. Усё жыццё ў гэтым плане – сукупнасць грамадскіх і асабістых адносін, выяўленых у тых ці іншых моўных учынках, а значыць у тым, што школа К.Станіслаўскага называе “славесным дзеяннем”.

***Пядзябедава Н.А.***, *дацэнт*

## АСАБЛІВАСЦІ ВЫВУЧЭННЯ СІНАНІМІЧНЫХ СТРУКТУР

Пры выкладанні замежнай мовы важнае значэнне надаецца выкарыстанню сінанімічных сродкаў мовы. Да ліку такіх сродкаў можна аднесці канструкцыі з інфінітыўнымі зваротамі і дадатнымі сказамі.

У сучаснай французскай мове існуе шэраг дзеясловаў, якія перадаюць розныя адценні эмацыянальнага настрою і здольны спалучацца з суб’ектыўным інфінітывам (пры